**Вучэбная дысцыпліна «Тэксталогія»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя) Спецыяльнасць: 6-05-0232-01 Беларуская філалогія Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент Модуль «Стылістычнае і літаратурнае рэдагаванне» |
| **Кароткі змест** | Прадмет і задачы тэксталогіі, месца ў сістэме філалагічных дысцыплін. Гісторыя тэксталогіі (еўрапейская і расійская тэксталогія). Станаўленне і развіццё беларускай навуковай тэксталогіі. Тэкст як галоўны аб'ект тэксталогіі. Сістэма крытэрыяў крытыкі тэксту; характарыстыка асноўных крытэрыяў тэксту. Творчая гісторыя: паняцце творчай гісторыі; асноўныя складнікі вывучэння творчай гісторыі. Творчы працэс як паняцце; этапы творчага працэсу. Выданне тэкстаў. Эдыцыйныя пытанні тэксталогіі: тыпы выданняў; асаблівасці размяшчэння матэрыялу ўнутры выдання; даведачны апарат выдання; сістэма тэксталагічных абазначэнняў у даведачным апараце. Літаратурнае крыніцазнаўства і яго месца ў тэксталагічнай працы: асноўныя складнікі літаратурнага крыніцазнаўства; сховішчы літаратурных крыніц. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння курса студэнты павінны ***ведаць:*** месца, ролю і значэнне тэксталогіі ў навуцы аб літаратуры і ў выдавецкай практыцы; змястоўнае напаўненне асноўных паняццяў тэксталогіі як навукі і галіны практычнай дзейнасці; асноўныя шляхі і прыёмы тэксталагічнага аналізу; ***ўмець:*** карыстацца прыёмамі і метадамі ўстанаўлення асноўнага тэксту; аналізаваць тэкст у сукупнасці яго варыянтаў, розначытанняў, выданняў і перавыданняў; укладаць зборы твораў пісьменнікаў, у тым ліку і акадэмічныя, складаць іх дапаможны апарат; прымяняць атрыманыя веды па тэксталогіі ў вучэбна-педагагічнай, журналісцкай і выдавецкай дзейнасці.<br>Вывучэнне дысцыпліны павінна збяспечыць фарміраванне ў спецыяліста **кампетэнцыі** СК-4: Выкарыстоўваць паняційна-катэгарыяльны апарат тэксталогіі пры аналізе літаратурнай крыніцы. |
| **Прэрэквізіты** | Гісторыя беларускай літаратуры. Гісторыя рускай літаратуры. Гісторыя замежнай літаратуры. Тэорыя літаратуры. Гісторыя беларускай крытыкі. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 90 акадэмічных гадзін, з іх 34 аўдыторных: 20 гадз. лекцый (з іх 4 КСР) і 14 гадз. практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 5 семестр, тэст, экзамен |